Упершыню выйшла ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

Масава-палітычны штотыднёвік

Выдавец УП "Газета Слонімская" Выходзіць адзін раз на тыдзень Заснавана 24 сакавіка 1997 года

№46 (388) Серада, 10 лістапада 2004 года www.gs.promedia.by

свежай і разнастайнай інфармацыі

СУДЗЯЦЬ БЫЛОГА СТАРШЫНЮ БТ ЯГОРА РЫБАКОВА

У Вярхоўным судзе Беларусі пачаўся працэс над былым старшынёй Белдзяржтэлерадыёкампаніі Ягорам Рыбаковым. Па просьбе сведкаў у справе Рыбакова працэс закрыты, але шмат хто ў Беларусі лічыць, што насамрэч улады баяцца агалоскі звестак, якія могуць скампраметаваць уплывовых асоб, што застаюцца на сваіх пасадах.

Шэрая брама з грукатам расчынілася, прапускаючы міліцэйскі аўтамабіль. У ім прывезлі на суд Ягора Рыбакова, былога старшыню Белдзяржтэлерадыёкампаніі. Аднак гэта карцінка не трапіць у навіны беларускіх тэлеканалаў, якімі кіраваў Ягор Рыбакоў. Побач з судом тэлекамер не было.

Працэс закрыты, журналістаў і прадстаўнікоў грамадскасці на яго не пускаюць. У пракуратуры патлумачылі, што гэтага захацелі сведкі. Нібыта ім пагражалі невядомыя асобы. У выніку пра працэс вядома толькі, што старшынюе на ім суддзя Аляксандр Райдудзін, інтарэсы абвінавачання прадстаўляе пракурор Алег Шандаровіч, абараняе Рыбакова адвакат Дзмітрый Гарачка.

Рыбакова абвінавачваюць у крадзяжы праз службовыя злоўжыванні і хабарніцтве. Яму пагражае да 15 гадоў турмы. Па звестках пракуратуры краіны, падчас вобыску ў ягоным доме было знойдзена больш як 500 тысяч даляраў, якія з'яўляюцца асноўным рэчавым доказам махінацый былога старшыні. Але падрабязнасці незаконных аперацый трымаюць у сакрэце.

Тыя, хто працаваў на Беларускім тэлебачанні, кажуць, што і да Рыбакова кіраўнікіараблялі незаконныя грошы на рэкламе і так званых "адкатах" – адлічэннях за выгадныя кантракты. Ці працягнулася гэта практыка ў час кіравання Ягора Рыбакова, меркаваць суду. А вось простым супрацоўнікам пры Рыбакове стала працаваць складаней, лічыць былы тэлежурналіст Эдуард Мельнікаў.

Паводле ягоных слоў, рэжымны аддзел сочыць за людзьмі, як яны працуюць, куды пайшлі. Зачынілі цэлыя паверхі, дзе працуе кіраўніцтва. Там татальны кантроль.

На думку Эдуарда Мельнікава, яшчэ больш закрыта беларускае тэлебачанне ад грамадства і гэта з'яўляецца асноўнай прычынай карупцыі сярод яго кіраўнікоў.

Год таму былая тэлевядучая Элеанора Язерская трапіла ў шпіталь пасля таго, як мінскі суд прысудзіў ёй шматмільённыя выплаты Ягору Рыбакову. Суд вырашыў, што беларуская тэлезорка зняважыла старшыню тэлекампаніі ў публічным выказванні адносна спраў на тэлебачанні. Сёння Элеанора Язерская прыйшла да будынка Вярхоўнага суда ў надзеі трапіць на працэс. Тое, што ён закрыты, Элеанора Язерская ўспрымае як пэўны доказ сваіх падазрэнняў.

Язерская лічыць, што камусьці, відаць, хочацца, камусьці трэба, каб не называлася гучна ягонае прозвішча. Таму, хто дапамагаў Рыбакову праварочваць гэтыя справы.

Прэсавая служба Вярхоўнага суда пакуль ніякіх звестак адносна працэсу не падае. Невядома нават, ці прызнае сябе Рыбакоў вінаватым.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ, Мінск

■ Аляксандр Зімоўскі, Ягор Рыбакоў і Ягор Хрусталёў, Мінск, 2002 г.

ЭКОНОМИЧЕСКИЙ ЛИКБЕЗ

МАТЕМАТИКА ПУСТОГО КОШЕЛЬКА

Промышленность вносит наибольший вклад в динамичное развитие Беларуси. Об этом недавно заявил президент страны Александр Лукашенко на церемонии вручения государственных наград передовикам производства.

По его словам, рост выпуска промышленной продукции составляет сегодня более 115% при прогнозе 110%. "Это тот локомотив, который позволяет нам энергично подтягивать социальную сферу и повышать благосостояние нашего народа", – сказал глава государства. Он подчеркнул, что показатель роста промышленного производства в Беларуси – лучший на всем постсоветском пространстве.

Действительно ли белорусская экономика переживает рост объемов производства? Несомненно, это так. И этот рост напрямую связан с ростом в российской экономике. Сейчас наш белорусский экспорт на 50% идет в Россию. Однако обольщаться таким положением вещей не стоит. Ведь реформированные российские частные предприятия налаживают выпуск аналогичной продукции, кроме того, российский рынок стал более привлекательным для западного производителя, который предлагает более качественный товар. Российский рынок, в свою очередь, не закрывается от западных инвестиций в отличие от нашего.

Рост в белорусской экономике происходит в условиях почти 30-процентного числа убыточных предприятий в республике. Как такое возможно? В нашем государстве убыточное предприятие не просто не разоряется, но еще и получает льготы от государства, освобождается от уплаты налогов. При этом продолжает выпускать продукцию, которая засчитывается как ВВП (валовой внутренний продукт). Государству такое предприятие приносит убытки и косвенно ведет к повышению цен. Но простых граждан ВВП интересует прежде всего с точки зрения увеличения их заработной платы. Однако в Беларуси ВВП растет за счет других показателей. К примеру, если в Минске на проспекте Ф.Скорины станут менять асфальт на плитку, то при снятии асфальта будут затрачены деньги, что создаст добавленную стоимость. При изготовлении плитки и ее укладке тоже будет создана добавочная стоимость. Потом на проспекте поставят тумбы, установят фонтаны. ВВП вырастет, а рядовой человек ничего не получит, кроме возможности пройтись по красивому проспекту.

Реальная заработная плата некоторых слонимчан по состоянию на октябрь 2004 года в соотношении со средней и обещанной средней зарплатой белорусов

Обещанная средняя зарплата 250$ (550 тыс. руб.)

Нынешняя средняя зарплата 165$ (363 тыс. руб.)



Теперь о повышении благосостояния народа. Как признался президент в одном из интервью, в Беларуси – одни из самых высоких цен на постсоветском пространстве. В то же время средняя заработная плата в нашей стране составляет 165 долларов США, а в следующем году (по обещаниям "сверху") достигнет 250 долларов. Однако многие из нас таких денег не увидят. Понятно, что средняя заработная плата – вещь весьма условная. И если директор предприятия получает, к примеру, 500 долларов США, а рабочий на его предприятии – едва 80 долларов, то средняя заработная плата будет равняться 290 долларам США. Вот такая арифметика.

Но лучше всего о благосостоянии нашего народа говорят данные Гродненского областного управления статистики. По данным облстатуправления, за девять месяцев текущего года с крупных и средних предприятий области (на которых работало 415 тысяч человек) было уволено 66,4 тысячи человек. Из них 82,5% – по собственному желанию и согласованию сторон. При этом в отдельных отраслях экономики число уволившихся превышает число принятых на работу. В организациях легкой промышленности уход работников компенсировался приемом новых кадров на 78%, на автомобильном транспорте – на 82%, в искусстве – на 83%, в торговле и общественном питании – на 87%.Основными причинами текучести кадров (по данным облстатуправления) являются низкая заработная плата и ухудшение условий труда. Вот такое оно "улучшение".

При этом белорусов призывают не переживать по поводу повышения цен на продовольственные товары и коммунальные услуги. Дескать, один–два рубля по кошельку "ударят" совсем незаметно. Оно и понятно: если денег в кошельке не было, то и исчезать нечему.

Янина МЕЛЬНИКОВА

СЛОНИМСКИЙ РЫНОК
ЦЕНЫ НА ПРОДУКТЫ
9.11.2004 г.

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	700 руб.
Творог	3 000 руб.
Масло	8000 руб.
Яйца (1 дес.)	1 360 - 2 500 руб.
Картофель	150 - 350 руб.
Капуста свежая	400 - 600 руб.
Морковь	500 - 1 000 руб.
Лук	700 - 1 000 руб.
Свёкла	300 - 500 руб.
Чеснок (за головку)	200 - 300 руб.
Помидоры	1 000 - 4 000 руб.
Бананы	1 700 руб.
Яблоки	500 - 1 500 руб.
Апельсины	2 200 - 3 000 руб.
Мандарины	2 000 - 3 500 руб.
Лимоны	1 500 - 2 500 руб.
Киви (1 шт.)	500 - 600 руб.
Огурцы	3 500 руб.
Виноград	2 200 - 3 800 руб.
Перец	1 500 - 2 000 руб
Дыня	2 500 руб.
Говядина	600 - 8 800 руб.
Свинина	6 000 - 10 370 руб.
Сало свежее	3 500 - 4 200 руб.
солёное	4 500 - 5 200 руб.
Сельдь	2 500 - 3 200 руб.
Макаронные изделия	1 000 - 1 500 руб.
Гречка	1 250 - 1 700 руб.
Рис	1 100 - 1500 руб.
Мука (2 кг)	1 900 - 2 300 руб.
Подсолнечное масло (1 л)	2 100 - 2 700 руб.
Мёд	13 000 руб.
Орехи грецкие	4 000 руб.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ
9.11.2004 г.

"Беларусбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2170	2200
1 EURO	2740	2855
1 ZL	580	670
1 RUR	73	76

"Белпромстройбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2170	2195
1 EURO	2750	2850
1 ZL	590	670
1 RUR	74	76,5

"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2175	2200
1 EURO	2720	2830
1 ZL	550	670
1 LAT	3700	4150
1 LIT	600	820
1 UAH	370	420
1 GBP	3600	4050
1 RUR	73	76

"Белгазпромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2175	2195
1 EURO	2750	2850
1 RUR	75	76,5

ЗНАХОДКА

АДКАПАЛІ ПАРЭШТКІ САЛДАТА

5 лістапада пры правядзенні земляных работ на полі за чыгуначным пераездам каля вёскі Разанаўшчына Слонімскага раёна рабочыя мясцовага вузла электрасувязі адкапалі чалавечыя парэшткі.

Побач з касцямі і фрагментамі спарахнелага ў зямлі адзення была знойдзена таксама граната. Пра сваю знаходку сувязісты адразу паведамілі ў міліцыю і ваенкамат.

Па словах слонімскага райваенкама Анатоля Міхальчыка, вызначыць, каго – савецкага ці нямецкага салдата – напаткала там смерць, па знойдзеных фрагментах было немагчыма. Парэшткі салдата забрала на экспертызу міжрайпракуратура, а гранату ўзарвалі сапёры.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

ВЕЛАСІПЕДЫ СКРАЛІ ПРОСТА З ДОМУ

У ноч з 5-га на 6-га лістапада з падворка дома гаспадароў у вёсцы Новая Стража невядомы злодзей украў дарожны веласіпед.

Аналагічны крадзеж адбыўся на некалькі дзён раней на вуліцы Валгаградскай у Альбярціне. У ноч з 3-га на 4-га лістапада там укацілі веласіпед з гаспадарчай пабудовы, што знаходзілася на падворку дома. Міліцыя шукае зладзеяў.

Мікола КАНАНОВІЧ

УТОЧНЕНИЕ

В статье «Лес должен давать прибыль» («ГС» №44 от 27 октября 2004г.), где идёт речь об очистке леса, была допущена неточность. Следует читать: «В ближайшее время у лесхоза не будет возможности нормально платить за данный вид работ». Редакция приносит свои извинения читателям и работникам лесхоза за допущенную ошибку.

ОПРОС

СЛОНИМ. НАШИ ЛЮДИ

ЧТОБЫ ПРОЦВЕТАТЬ, НАДО РАБОТАТЬ

Прошел референдум, закончились выборы. Результат и того и другого политического события — люди проголосовали "за сильную и процветающую страну". Как сделать страну такой — совсем другой вопрос. Главное — определиться, что значат эти слова для рядового белоруса.

"Что для вас сильная и процветающая Беларусь?" — спрашивали корреспонденты "ГС" слонимчан 8 ноября.

Павел:

— Сильная страна должна быть такой, чтобы людям в ней хотелось улыбаться, радоваться жизни, чтобы они были уверены в завтрашнем дне. Что для этого надо? Думаю, хороший президент.

Елена:

— Сильная и процветающая страна — это ухоженная красивая страна. Не только наша столица, Минск, должна быть нарядной, но и маленькие города, такие, как Слоним. Надо, чтобы молодежи было чем заняться, куда себя деть. Детям нужны кинотеатры, дискотеки.

Юля:

— Процветающая страна — это страна, в которой всем есть место для жизни, для каждого есть работа по душе. Я, вчерашняя студентка, сегодня — молодой специалист без работы. Моя специальность — инженер-химик, технолог-эколог. Работы для меня в Слониме просто нет. А ведь экология — очень важная проблема, без которой не будет процветающей страны.

Женщина (назваться не пожелала):

— Надо, чтобы люди хорошо жили в стране, получали хорошую зарплату, не болели. Всегда имели крышу над головой. Я проработала 37 лет. Вложила в работу всю свою жизнь. Знаю: надо, чтобы молодежь трудилась. Если молодым будет чем себя занять, будет меньше пьяных и преступников.

Янина МЕЛЬНИКОВА

ЗДАРЭННЕ

Фота Тацяны ПЛАХЕТКА

▪ Пасля нечаканага тарану і сустрэчы са слупам

ПРАТАРАНІЎ ЗЗАДУ

Днём 5 лістапада 22-гадовы работнік Слонімскага лясніцтва Міхаіл Васкрасенскі сеў за руль сваёй іншамаркі "Форд-Сьера" пасля ўжывання спіртнога.

Рухаючыся па вуліцы Баграціёна, ён выбраў неадпаведную хуткасць і дыстанцыю, як след — не справіўся з кіраваннем і сутыкнуўся з аўтамашынай, якая ішла наперадзе. У выніку старэнькі "Форд", якога ззаду пратараніў Васкрасенскі, збіў электрычны слуп у раёне Лабазоўскага возера.

На шчасце, абышлося без ахвяраў. Аднак з месца ДТЗ Васкрасенскі ўцёк, а потым яшчэ заявіў у міліцыю, што яго аўтамабіль угналі.

Падмануць такім чынам работнікаў правапарадку яму не ўдалося, а за аварыю прыйдзецца адказваць па законе.

За апошні час гэта ўжо другое падобнае дарожна-транспартнае здарэнне, у якім вызначаюцца работнікі лясной гаспадаркі. Напрыканцы кастрычніка п'яны рабочы Міжэвіцкага лясніцтва паламаў трактарнымі плугамі плот і знёс два электраслупы ў вёсцы Вострава.

Мікола КАНАНОВІЧ

АХОВА ЗДАРОЎЯ

ЦІ БЫЛА СІБІРСКАЯ ЯЗВА Ў МАСТАХ?

На мінулым тыдні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях распаўсюдзіла інфармацыю, што ў Гродзенскую абласную інфекцыйную бальніцу трапіла 23-гадовая пацыентка з падазрэннем на сібірскую язву.

Па звестках міністэрства, жанчыну прывезлі ў гарадскую бальніцу "хуткай дапамогі" ў сувязі з родамі.

Як пазней высветлілася, гродзенскія медыкі ўстанавілі, што парадзіха з вёскі Мілявічы Мастоўскага раёна хворая на пранцы (сіфіліс), і адначасова ў іх узнікла падазрэнне на захворванне ў гэтай жанчыны сібірскай язвай.

А раз гэта рэдкае захворванне, то да праверкі дыягназу падключыліся рэспубліканскія медыкі. Цяпер дыягназ на захворванне сібірскай язвай не пацверджаны, аднак канчатковы вынік медыкі скажуць толькі праз дзесяць дзён, бо неабходна правесці новыя даследаванні. Па словах галоўнага ветэрынарнага доктара сельгасвытворчага кааператыва "Мілявічы" Віталя Савоські, сям'я К. — муж, жонка і двое дзяцей — прыехала ў вёску прыкладна два месяцы таму з Гродна. Для пражывання яны нанялі дом. Мужчына пайшоў працаваць даглядчыкам на ферму.

Роды адбыліся дома, затым жанчыну даставілі ў Мастоўскую бальніцу, а пасля — у Гродна.

Цяпер у доме К. ніхто не пражывае. Гаспадар таксама знаходзіцца на абследаванні, але папярэдне ён сказаў, што яго жонка раней сапраўды хварэла на сіфіліс і лячылася.

Максім ПАДГОРНЫ

З НАТУРЫ

ЯК ІВАН СЦЯПАНАВІЧ ДА ДОКТАРА ЕХАЎ

26 кастрычніка інвалід трэцяй групы Іван Сцяпанавіч Хілімончык устаў рана — трэба было з цэнтра горада ехаць да доктара ў раённую паліклініку.

Каб першым трапіць на прыём, Іван Сцяпанавіч паехаў у Альбярцін на "васьмёрцы", што адпраўляецца ў 6.15, хаця паліклініка пачынае працаваць толькі а восьмай гадзіне раніцы.

Аднак хутка трапіць да доктара ў Івана Сцяпанавіча не атрымалася. На прыпынку "Гарпаліва" вадзіцель аб'явіў, што аўтобус сапсаваўся і далей не пойдзе. Іван Сцяпанавіч разам з іншымі пасажырамі пакінуў салон. Нешматлікія ў гэты ранні час пасажыры разышліся, а Іван Сцяпанавіч застаўся на прыпынку.

"Як толькі людзі разышліся, вадзіцель хутка завёў аўтобус і паехаў у бок Альбярціна, я нават крыху падбег за аўтобусам, каб мяне забраў, але шафёр, відаць, мяне не заўважыў. Ды і бягун з мяне слабы — ад хадзьбы нават задыхаюся!" — расказаў у рэдакцыі "ГС" сваю ранішнюю гісторыю інвалід.

Іван Сцяпанавіч дачакаўся наступнага аўтобуса, яшчэ раз заплаціў за праезд і дабраўся да паліклінікі да пачатку прыёму, але ў чарзе да доктара быў ужо толькі сёмы. Абурае хворага чалавека нават не тое, што прыйшлося два разы плаціць, каб даехаць у адзін бок, хаця і гэтыя рублі для інваліда не лішнія. "Чаму яны выпускаюць на лінію ламату?" — пытаўся Іван Сцяпанавіч.

Адказам на пытанне інваліда могуць быць некаторыя лічбы, якія назваў карэспандэнту "ГС" галоўны інжынер аўтапарка №3 Уладзімір Сідарэнка. Па звестках спецыяліста, у аўтапарку сёння ёсць толькі сем новых аўтобусаў, якія выходзяць на гарадскія маршруты. 33 адзінкі тэхнікі маюць амартызацыйны знос больш як на 100%, 10 — ад 90 да 100% ды плюс яшчэ некалькі аўтобусаў, якія адпрацавалі сваё на 70–80%. І хоць многія старыя машыны прайшлі капітальны рамонт, ад паломкі, як кажуць, няма страхоўкі. А ехаць даводзіцца на тым, што ёсць. У аўтапарку, дарэчы, ёсць яшчэ чатыры новыя "Газелі". Гэтыя маршрутныя таксі ходзяць і ў Альбярцін, праўда, плаціць там трэба крыху даражэй.

Мікола КАНАНОВІЧ

ДАІ

СУМНАЯ СТАТЫСТЫКА

За 10 месяцаў гэтага года на Слонімшчыне адбылося 39 улічаных дарожна-транспартных здарэнняў, у выніку якіх загінулі і пацярпелі людзі.

Пра гэта карэспандэнту "ГС" паведамілі ў аддзяленні ДАІ Слонімскага РАУС. За гэты час загінулі 11 чалавек, а 43 атрымалі траўмы.

Было выяўлена 9 319 розных дарожна-транспартных парушэнняў, затрымана 508 чалавек, якія кіравалі аўтамабілямі ў нецвярозым стане, каля 3 000 — за перавышэнне хуткасці.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗДАРЭННЕ

ЗА АДЗІН ВЕЧАР ПАБІЛІ ТРАІХ

За вечар 7-га лістапада зафіксаваны тры факты збівання людзей. Мусіць, дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі натхніў на хуліганскія подзвігі пэўных грамадзян.

Так, каля 22 гадзін вечара ў вёсцы Жыровічы на вуліцы Маладзёжнай грамадзянін Ч., без усялякіх на тое падстаў, нанёс некалькі ўдараў у твар грамадзяніну А. Па факце нанясення пабояў праводзіцца праверка.0

Прыкладна ў той жа час у Слоніме на вуліцы Францыска Скарыны двое невядомых збілі слонімца Р. і зніклі. Іх пошукам цяпер займаецца міліцыя.

Яшчэ адну праверку работнікі міліцыі праводзяць па факце збівання жыхара вёскі Мяльканавічы Б., які таксама пацярпеў вечарам 7 лістапада.

Мікола КАНАНОВІЧ

ВОПРОС–ОТВЕТ

ПО СЛЕДАМ "ГОРЯЧЕЙ ЛИНИИ"

УСТАВ ШКОЛЫ НАДО ПИСАТЬ ВМЕСТЕ

☎ *Расскажите, пожалуйста, существует ли в белорусском законодательстве об образовании понятие нормы школьной формы?*

Жительница д. Мижевичи

ОТВЕТ. Нормативно-правового акта, регламентирующего обязательность ношения в школе школьной формы, а также ее цвет, размер и тому прочее, в Республике Беларусь не существует. Скорее всего, ношение школьной формы (ее цвет, размер и т.п.) регламентируется Уставом школы, то есть локальным нормативным актом. Отчислить (или каким иным образом наказать) ученика за несоответствие его одежды утвержденной Уставом школы школьной форме, школа не имеет права. Однако, на наш взгляд, руководство школ при разработке Устава школы должно более тесно сотрудничать с родительским комитетом: учитывать не только санитарные требования, требования техники безопасности при утверждении школьной формы, но и материальное положение родителей учащихся. Не лишним будет обратить внимание и на веяния современной моды, конъюнктуру местного рынка. То есть подходить к решению данного вопроса с обоюдовыгодных позиций.

ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА НИЖЕ ПРОЖИТОЧНОГО МИНИМУМА

☎ *Я работаю на фабрике художественных изделий. У нас на предприятии много молодых работников: учениц, заработная плата которых гораздо меньше, чем остальных работников. Слышала, что за них с предприятия снимают какой-то налог. Почему фабрика должна платить за тех, кто мало получает?*

Тамара Павловна

ОТВЕТ. Речь, скорее всего, идет не о налоге, а об уплате страховых взносов. В соответствии с новой редакцией Указа Президента РБ "О фонде социальной защиты населения Министерства труда и социальной защиты", вступившей в силу с 1 июля 2003 г., уплата обязательных страховых взносов производится со всех видов выплат, начисленных за истекший месяц в пользу работников независимо от источников финансирования, кроме выплат, предусмотренных законодательством. При этом сумма обязательных страховых взносов, причитающаяся к уплате за истекший месяц, должна быть не менее суммы названных взносов, исчисленной из величины утверждаемого в установленном порядке бюджета прожиточного минимума в среднем на душу населения.

МОЖНО ВСКРЫТЬ КВАРТИРУ, А ПОТОМ ИЗВИНИТЬСЯ

☎ *Квартиру моего соседа вскрыла милиция, когда его не было дома. Ничего подозрительного там не нашли. Скажите, может ли милиция или аварийные службы вскрыть квартиру в отсутствие хозяина? И кто отвечает за сохранность вещей?*

Анна Александровна Белоцкая

ОТВЕТ. Во-первых, за сохранность вещей отвечают те органы или службы, которые «вскрыли» квартиру в отсутствие ее собственников (нанимателей).

Во-вторых, статья 29 Конституции РБ гласит: "Неприкосновенность жилища и иных законных владений граждан гарантируется. Никто не имеет права без законного основания войти в жилище и иное законное владение гражданина против его воли". Работу милиции регламентирует Закон РБ "О милиции". Согласно ему для выполнения возложенных на милицию обязанностей ей предоставляется право входить беспрепятственно, при необходимости с повреждением запирающих устройств и иных предметов, в любое время суток в жилые и иные помещения граждан, на принадлежащие им земельные участки, в помещения и на территорию предприятий, учреждений и организаций и осматривать их при преследовании лиц, подозреваемых в совершении преступления, либо при наличии достаточных оснований полагать, что там совершается или совершено преступление, произошел несчастный случай, авария, либо находится лицо, скрывшееся от органов дознания, следствия и суда, уклоняющееся от исполнения уголовного наказания, или имеют место иные аналогичные обстоятельства, угрожающие личной или общественной безопасности, или при производстве неотложных следственных действий.

Согласно Закону РБ "Об аварийно-спасательных службах и статусе спасателя" спасатели, привлеченные к аварийно-спасательным работам, имеют право: по предъявлении удостоверения спасателя на беспрепятственный проход на территорию и объекты организаций, а также в жилые помещения для проведения аварийно-спасательных и других неотложных работ. Милиция и аварийно-спасательные службы несут ответственность, предусмотренную законодательством РБ, за вред, причиненный неправомерными действиями этих органов в ходе осуществления своей деятельности гражданам.

Сергей ГЕРАСИМЧИК, юрист "Газеты Слонімскай"

ЗЕМЕЛЬНЫЙ ВОПРОС

В ОЧЕРЕДЬ, ГОСПОДА!

Некоторые жители нашего города в начале этого года столкнулись со следующей проблемой: по три–четыре месяца вынуждены они ожидать оформления государственного акта на земельный участок.

Причина в том, что в Слониме нет специалиста-землеустроителя с правом производить данный вид деятельности. А государственные акты владельцам земли необходимы для оформления наследства, купли-продажи участков.

Государственный акт на земельный участок и удостоверение на право временного пользования земельным участком выдаются: сельскими (поселковыми) исполнительными и распорядительными органами – при предоставлении земельного участка из земель сельских населенных пунктов, городских, рабочих, курортных поселков; городскими исполнительными и распорядительными органами – при предоставлении земельного участка из земель городов; районными исполнительными и распорядительными органами – при предоставлении земельного участка из земель городов районного подчинения и городских поселков, переданных в их ведение, а также из земель других категорий.

Регистрация и учет государственного акта на земельный участок и удостоверения на земельный участок осуществляются землеустроительной службой местных исполнительных и распорядительных органов.

В прошедшем году составлением госактов на землю в Слониме занимался индивидуальный предприниматель Денис Волобуев, имеющий лицензию на этот вид деятельности. Однако предприниматель может в месяц составлять только 5–6 таких актов, желающих же его оформить – значительно больше. Кроме того, сейчас он временно приостановил работы.

Как пояснила корреспонденту "ГС" специалист отдела земельных ресурсов Слонимского районного исполнительного комитета, для этого в Слоним из Минска и Гродно приезжают специалисты двух организаций "Белгидрозем" и "Белгеодезия". Они собирают все документы, квитанции об оплате за услуги и отправляются домой. Проходит несколько месяцев – и только после этого государственный акт оказывается на руках владельцев земли.

Этот документ на земельный участок и удостоверение на право временного пользования земельным участком составляются в двух экземплярах. Один экземпляр выдается землепользователю или землевладельцу, другой – хранится в соответствующем исполнительном и распорядительном органе. До составления и выдачи государственных актов и удостоверений проводятся землеустроительные работы по установлению или восстановлению границ участка, в целях определения его размеров.

Янина МЕЛЬНИКОВА

ЗДОРОВЬЕ

ЕСЛИ ХОЧЕШЬ БЫТЬ ЗДОРОВ – ПРИВИВАЙСЯ!

В январе–феврале 2004 года медики пророчат нам очередную эпидемию гриппа. А чтобы не заболеть, советуют сделать прививку.

В настоящее время в поликлиниках города имеется 2 вакцины российского производства – «Гриппопол» и «Гриповакс». По словам заместителя главврача районной поликлиники Галины Моисеенковой, вакцина имеется в достаточном количестве. По ее мнению, больший наплыв желающих привиться ожидается с наступлением холодов.

Тем не менее уже с 10 октября проводится как платная, так и бесплатная вакцинация. Бесплатной вакцинации подлежат пожилые люди, дети дошкольного возраста и школьники младших классов, люди с хроническими заболеваниями. Остальные жители города и района могут сделать прививку, заплатив 6 950 рублей. Не лишней окажется прививка для людей с пониженным иммунитетом, т.к. именно у них возможны осложнения после перенесенного гриппа. Прививать можно также и детей с 6 месяцев.

Иммунитет к вирусу вырабатывается в течение 3 недель и сохраняется на протяжении 10–12 месяцев. Следует отметить, что привиться можно только с разрешения участкового врача, который проведет осмотр. Вакцинация противопоказана людям, которые имеют аллергическую реакцию на куриный белок, на отдельные компоненты вакцины или находятся в стадии обострения хронического заболевания.

Жители сел и деревень могут пройти вакцинацию по месту жительства.

Некоторые предприятия проводят вакцинацию среди своих работников, что, кстати, считается более выгодным, чем платить больничные. А военнослужащие слонимской 11-ой механизированной бригады уже прошли вакцинацию.

Однако полагаться полностью на вакцину, считают врачи, не стоит, следует проводить профилактические мероприятия, особенно в период обострения заболеваемости гриппом. Кроме того, нужно помнить, что вакцина спасает только от гриппа, но не от ОРЗ. В профилактике простудных заболеваний, отмечают медики, не лишними окажутся поливитамины, травяные чаи, походы в баню и массаж.

Елизавета МЕЛЬНИК

ФІНАНСЫ

НЯЎЖО НАС ЧАКАЕ ДЭФОЛТ?

Нядаўна экс-старшыня Нацбанка Беларусі доктар эканамічных навук Станіслаў Багданкевіч заявіў, што ў бліжэйшы час дэфолт пагражае нашай дзяржаве.

Як сказаў ён газеце "Комсомольская правда в Белоруссии", павышаюцца заробкі і грашовая маса расце куды хутчэй, чым нацыянальны прадукт. Расце запазычанасць эканомікі перад банкамі. Многія прадпрыемствы неплацежаздольныя.

А каб закупляць сыравіну, плаціць заробак і г.д., бяруць крэдыты ў банках, гэта значыць – трацяць нашы зберажэнні на банкаўскіх рахунках. І калі сёння беларусы пачнуць забіраць з банкаўскіх рахункаў свае грошы, пераводзіць іх у даляры і захоўваць дома, беларускаму рублю будзе цяжка заставацца стабільным. Альбо даляр пойдзе расці, альбо банкам стане цяжка выплачваць грошы насельніцтву.

Звычайна пад дэфолтам падразумяваюць немагчымасць урада разлічыцца па фінансавых запазычаннях на знешнім і ўнутраным рынках. Дэфолт у свой час перажылі некаторыя краіны, найперш Аргенціна, Паўднёвая Карэя, а ў 1998 годзе і Расія. Тады ў нашай суседкі зарплата знізілася ў тры разы, а цэны на тавары мяняліся на некалькі разоў на дзень – і яны павялічваліся.

Ці пагражае дэфолт нашай краіне? Такое пытанне карэспандэнт "ГС" задаў слонімскім банкірам.

Упраўляючая аддзяленнем "Белаграпрамбанка" ў Слоніме Вольга Вількоўская аднязначна ўпэўнена, што Беларусі ў бліжэйшы час дэфолт не пагражае. А дырэктар слонімскага філіяла "Беларусбанка" Аляксандр Лагуцік сказаў: "Мне цяжка на гэтае пытанне адказаць. Я магу пракаментаваць толькі тую сітуацыю, якая на сёння складваецца ў нашым філіяле "Беларусбанка". А ў нас фінансавыя справы ідуць даволі нядрэнна. Ды і зарплата выплачваецца своечасова. Таму хваляванні наконт дэфолту лічу дачаснымі".

Сяргей ЧЫГРЫН

КОНКУРС

В КОЛЛЕДЖЕ ЕСТЬ СВОИ ТАЛАНТЫ

В Жировичском агротехническом колледже среди учащихся первых курсов прошёл конкурс «Алло, мы ищем таланты!».

В борьбе за победу будущие механики и электрики проявляли свои способности в пении, хореографии, актёрском мастерстве и юморе.

Первое место в номинации «Вокал» жюри присудило 68 М группе, а в номинации «Стэм» первое место досталось 68 Э группе. Победители были награждены почётными грамотами и призами. А администрация колледжа поощрила юных талантов денежной премией.

Екатерина БЕРЕЗОВСКАЯ

ТОРЖЕСТВО

ПОСВЯЩЕНИЕ В ПРОФЕССИЮ

Целую неделю оживление царило в стенах СПТУ-129 текстильщиков. Вызвано оно было праздничными мероприятиями, проводимыми в честь первокурсников.

Учащиеся старших курсов принимали «молодых» в свои ряды. Каждая кафедра старалась сделать посвящение праздничным и торжественным.

Будущие портные, продавцы, швеи, слесари, парикмахеры, повара уже на полноправных основаниях клятвенно обещали с гордостью нести звание своих профессий и осваивать азы мастерства.

Старшекурсники, показывая свои умения, восхищали не только вчерашних школьников, но и своих педагогов, которые с гордостью могли оценить работы воспитанников.

Шикарные модели одежды, эксклюзивные прически, изысканные блюда – все это было представлено участникам и гостям праздника наряду с веселыми песнями, танцами, конкурсами, викторинами, вызвавшими улыбки на лицах присутствующих.

Праздник посвящения в профессию – традиционный в училище. Но каждый год учащиеся и их педагоги находят все новые и новые формы, делая обряд посвящения в мастерство интересным и запоминающимся.

Николай РОДИОНОВ

Фота Станіславы БЯЛЯНІНАЙ

■ Причёска делалась с завязанными глазами за одну минуту

Фота Станіславы БЯЛЯНІНАЙ

■ За конкурсной работой — будущие слесари

ЖЕСТВЕННЫЙ ЗНАК

В ГРОДНО ЗАМИРОТОЧИЛА ИКОНА СЕРГИЯ РАДОНЕЖСКОГО

Икона Сергия Радонежского замироточила в Свято-Рождество-Богородицком женском православном монастыре в Гродно. Об этом сообщила настоятельница данного монастыря игуменья Гавриила Глухова.

По ее словам, "уже несколько дней капли мира стекают с лика и епитрахили (облачения) Святого".

– Вещество, которое выделилось из иконы, по консистенции больше напоминает воду, чем, к примеру, жидкий воск. Но это не вода, потому что, высохнув, капли оставили видимый след на изображении, а не испарились без следа, – подчеркнула настоятельница монастыря.

По ее словам, какого-то толкования мироточению иконы дать невозможно: "это однозначно знамение, но что оно предвещает, знает только Господь".

– Истории известны случаи мироточения, после которых наступал расцвет общества, есть случаи, когда оно стало предвестником упадка и несчастий, – пояснила игуменья Гавриила.

Икона Сергия Радонежского, находящаяся в Свято-Рождество-Богородицком женском православном монастыре в Гродно, была подарена ему в 1892 году. По словам настоятельницы, это первый случай ее мироточения, как и первый случай самого мироточения икон в этом монастыре.

Комментируя по просьбе "Интерфакса" данный факт, сотрудник Белорусского экзархата архимандрит Алексий подчеркнул: "Мироточение иконы является знамением милости Божьей к белорусскому народу, знамением благоволения и Божьей поддержки в деле возрождения православных святынь, которые были поруганы и осквернены".

– Мироточение иконы является особым божественным знаком того, что Беларусь идет по созидающему пути, – подчеркнул священник.

В данной связи он сообщил:

– Несмотря на экономические трудности, в Беларуси за последние 10 лет возрождены и построены десятки православных церквей, более 20 монастырей.

– Это, безусловно, ободряющий знак для верующих, – уверен архимандрит Алексий.

Он рассказал, что "Свято-Рождество-Богородицкий женский монастырь в Гродно является старейшим православным монастырем на территории Западной Беларуси, где на протяжении нескольких веков доминировала римско-католическая конфессия".

"Созданный в 1843 году монастырь в годы Советской власти как культовое здание был закрыт, и в нем более 10 лет размещался музей атеизма, а на месте самого священного места в церкви – алтаря – была установлена кощунственная выставка, которая высмеивала православные традиции", – рассказал собеседник агентства.

"Интерфакс"

НАВІНЫ

РЭПЕТЫЦЫЯ ТЭСЦІРАВАННЯ

СЛОНІМ. На працягу ўсяго мінулага тыдня ў Слонімскай СШ №8 праходзіла рэпетыцыйнае тэсціраванне.

Адрозненне рэпетыцыйнага тэсціравання ад сапраўднага ў тым, што вынікі яго не маюць пэўнай сілы.

Такім чынам, вучні дзесятых і адзінаццатых класаў усіх школ горада і раёна мелі магчымасць пазнаёміцца з самой сістэмай правядзення тэсціравання і вызначыць узровень сваіх ведаў.

Антон ТРАФІМОВІЧ

НА ДВА ШЛЮБЫ – АДЗІН РАЗВОД

МАСТЫ. Згодна са статыстыкай, за 9 месяцаў гэтага года ў Мастах узялі шлюб 147 пар, разам з тым за гэты час 74 шлюбы былі скасаваныя. 27 пар з тых, хто ўзяў шлюб, зрабілі гэта паўторна, адна пара – тройчы.

Самай маладой нявесце крыху болей за 16 гадоў, самы малады жаніх мае 19 гадоў.

ФЕСТЫВАЛЬНЫ ДЭСАНТ У ГРОДНЕ

МАСТЫ. 12 лістапада ў абласным цэнтры прайшоў справаздачны канцэрт артыстаў Мастоўшчыны.

Па папярэдніх звестках, у ім прынялі ўдзел 250 самадзейных артыстаў раёна.

Антон МАКЕЙ

НАВІНЫ

ПРОСЯЦЬ АЎТОБУСЫ, АДНАК НЕ ЕЗДЗЯЦЬ

МАСТЫ. Апошнім часам Мастоўскі аўтапарк №9 пачаў аднаўляць раней адмененыя нерэнтабельныя рэйсы. Адбываецца гэта пасля звароту грамадзян у райвыканкам. Аднак новыя рэйсы прыносяць толькі новыя страты прадпрыемству. Напрыклад, на рэйс Масты–Каўшы, які праходзіць яшчэ праз тры вёскі, 20 кастрычніка не прадалі ні аднаго квітка. Начны гарадскі аўтобус за 17 дзён перавёз усяго 16 пасажыраў.

Неўзабаве павінен будзе пайсці аўтобус па маршруце Масты–Падбараны, але кіраўніцтва аўтапарка не ўпэўнена, што ён будзе рэнтабельны.

Страты, атрыманыя ад адкрыцця такіх рэйсаў, кладуцца на прадпрыемства, бо раённыя ўлады гэтыя затраты не заўсёды кампенсуюць.

Антон МАКЕЙ

ГРЫЎНІ СТАЛІ КАРЫСТАЦЦА ПОПЫТАМ

МАСТЫ. У сувязі з тым, што ў мастоўцаў сталі папулярнымі паездкі на Украіну па танны тавар, мясцовае аддзяленне "Белаграпрамбанка" стала аказваць новы від паслуг.

Валютныя касы з першага лістапада распачалі продаж украінскай валюты – грыўняў. Дарэчы, попыт на ўкраінскую валюту штодня расце.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЗДАРЭННІ

У КВАТЭРУ ТРАПІЛІ ПРАЗ АКНО

СЛОНІМ. Днём 5-га лістапада праз акно першага паверха зладзеі залезлі ў кватэру, што на Водаправодным завулку ў Слоніме.

Іх здабычай сталі тэлевізар "Панасонік", камп'ютэр і іншыя каштоўныя рэчы.

Па факце гэтага крадзяжу ўзбуджана крымінальная справа, вядзецца пошук "дамушнікаў".

Мікола КАНАНОВІЧ

ПАД КОЛАМІ ЗАГІНУЎ ПЕНСІЯНЕР

СЛОНІМ. У Слоніме на Брэсцкай вуліцы каля маторарамонтнага завода адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, у выніку якога загінуў чалавек.

Аўтамабілем "Масквіч-408", якім кіраваў слесар КПФ, быў збіты 79-гадовы слонімец.

Пенсіянера даставілі ў рэанімацыйнае аддзяленне слонімскай бальніцы, але выратаваць яго жыццё дактарам не ўдалося. Ад атрыманых ран чалавек памёр.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗАКАЗАЎ БЫЛУЮ ЖОНКУ

ЛІДА. 26-гадовы жыхар горада Бярозаўка Лідскага раёна пагадзіўся за 200 даляраў забіць былую жонку свайго былога школьнага настаўніка.

Потым заказчык забойства передумаў плаціць грошы і вырашыў разлічыцца з кілерам залатым ланцужком коштам 270 даляраў ЗША, а кілер павінен быў вярнуць яму рэшту – 70 даляраў. На тым і сышліся.

Забойства жонкі вартаўнік дзіцячага садка з вёскі Ганчары, былы школьны ваенрук, планаваў, каб пасля скасавання шлюбу не дзяліцца са сваёй "палавінкай" сумесна нажытым дабром.

Забойца павінен быў справакаваць дарожна-транспартнае здарэнне і збіць жанчыну, якая кожную раніцу ездзіла на веласіпедзе з вёскі ў горад. Мауляў, няшчасны выпадак – і справа вырашана.

Работнікі міліцыі папярэдзілі ахвяру за 20 мінут да замаху на яе жыццё. Як расказаў газеце "Савецкая Беларусь" старшы оперупаўнаважаны крымінальнага вышуку Лідскага РАУС Міхаіл Лазуткін, жанчына спачатку не паверыла работнікам міліцыі і толькі пасля праслухоўвання запісу размовы былога мужа з кілерам пагадзілася ўдзельнічаць у інсцэнаваным міліцыяй ДТЗ.

Прыкладна ў 7 гадзін раніцы 1 лістапада заказчык на месцы "здарэння" выдаваў сябе за прыгнечанага горам мужа. А ўжо ў 9.30 ён разлічыўся з кілерам – аддаў яму залаты ланцужок, а той адлічыў рэшту – 70 даляраў. Заказчык у той момант не ведаў, што кілер своечасова пагадзіўся супрацоўнічаць з міліцыяй і іх размова запісваецца на стужку.

З СЯКЕРАЙ ГАНЯЎ СУЖЫЦЕЛЬКУ

ДЗЯТЛАВА. Жыхар вёскі Пагіры Дзятлаўскага раёна, які раней ужо меў судзімасць, зноў вызначыўся тым, што з сякерай у руках ганяў па падворку ўласнага дома сваю сужыцельку.

Пры гэтым, як паведамляе "Міліцэйскі веснік", мужчына пагражаў жанчыне забойствам.

ЗЛІЛІ БЕНЗІН І САЛЯРКУ

ВАЎКАВЫСК. Два выпадкі крадзяжу аўтатрактарнага паліва на тэрыторыі Ваўкавыскага раёна зарэгістраваны за адну ноч.

Паводле "Міліцэйскага весніка", у вёсцы Чырвоны Груд на аўтазаправачнай станцыі, якую ахоўваў вартаўнік, невядомыя злачынцы прасвідравалі дзірку ў цыстэрне і злілі адтуль 517 літраў бензіну "А-76" на агульную суму 430 тысяч рублёў.

А з рэзервуара АЗС сельгаскааператыва "Нявяровічы" ў пасёлку Юбілейны невядомыя злілі 562 літры саляркі коштам 464 тысячы рублёў.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

ЯНЫ Ў МЯНЕ ЯК ЗОРАЧКІ, ЯК КВЕТАЧКІ ВЯСНОЙ...

У гародчыку іхняга дома, што на вуліцы Гагарына ў Дзятлаве, летам цвіло шмат кветак, але белых півоняў было найбольш. Складвалася такое ўражанне, што з летняга неба ўпала пахучае белае воблачка. Ні там, дзе раслі кветкі, ні на градках — не было ніводнай травінкі.

Гаспадыня Таіса Паўлаўна Бубен сустрэла мяне на ганку і запрасіла ў невялікі ўтульны дом, дзе ўсё ззяла чысцінёй і кожная рэч была на сваім месцы. Я пахваліла яе за гаспадарлівасць.

— О, у нас тут вялікая сям'я, і калі б кожны не стараўся падтрымліваць парадак, то толку не было б, — прыязна кажа гаспадыня.

Стройная, з густам апранутая, яна не выглядае на свае гады. Ні за што не скажаш, што яе сыну хутка споўніцца трыццаць, а праз год і дачцэ будзе столькі ж.

— Васьмёра чалавек жыве ў трох пакойчыках, — працягвае далей Таіса Паўлаўна. — Сын з нявесткай і ўнукам, а праз некаторы час у іх народзіцца яшчэ адно дзіцятка. Я, мая старэнькая мама, якую забрала дагледзець з вёскі Каўпінскія, унучка — даччына дачка — з горада Ліды, што прыязджае да мяне на ўсё лета, і яны, дзве Богам дадзеныя дачушкі, — Лена і Наташа.

Дарэчы, яны вельмі падобныя на маму Таісу Паўлаўну. Гэтыя дзяўчынкі-сястрычкі па крыві ёй чужыя, а па душы — свае, родныя і любыя.

...Кожнае лета дырэкцыя Дзятлаўскай школы-інтэрната праз раённую газету просіць жыхароў горада і навакольных вёсак узяць на канікулы ў свае сем'і выхаванцаў гэтай навучальнай установы. Ім, сіротам, няма да каго ехаць, бо ў каго бацькі паўміралі, а ў каго пазбаўлены гэтых святых правоў з-за празмернай цягі да спіртнога. А дзеткам так хочацца пажыць у сям'і, адчуць ласку і пяшчоту.

Таіса Бубен, добрая душа, маючы дваіх дарослых дзяцей, таксама пяць гадоў запар брала ў сваю сям'ю па чацвёра хлопчыкаў.

— Але ж і клопату з імі, каб вы ведалі! — не са злосцю, а з цёплай усмешкай кажа яна. — Павяду, бывала, на возера купацца, то ўся душа збаліцца, каб жа хаця не патанулі. У ягады ці ў грыбы паедзем, то стараюся не адпускаць нават на некалькі крокаў, бо раптам заблудзяцца... А хлопчыкі, як вядома, народ няўрымслівы. Ім і на дрэва трэба залезці, і па лясных гушчарах пашастаць. Быў у мяне хлопчык — казах Алібек Німасіпаў. Дык ён злавіў у лесе птушачку і так яе прыручыў, што яна ўвесь час на плячы сядзела, з рук корм брала.

На вялікі жаль, Алібека ўжо няма сярод жывых. Ён трагічна загінуў у васемнаццаць гадоў і пахаваны на дзятлаўскіх могілках. Ці трэба казаць, што яго магілу дагледаюць руплівыя рукі Таісы Паўлаўны. Расказваючы пра гэта, жанчына не магла стрымаць слёз, таму што боль страты жыве ў сэрцы ўжо многія гады.

...Зноў надышло лета, і зноў дырэкцыя школы-інтэрната пачала прасіць: вазьміце дзяцей на канікулы.

